# Працуем па новых падручніках

***Антановіч Н. М.***, *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антонава Н. У.***, *начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. II клас

## Установы адукацыі з беларускай мовай навучання

*Заканчэнне. Пачатак гл. № 9–12 за 2022 г., № 1–3 за 2023 г.*

### Урок 81*. Прыназоўнік

***Мэты ўрока:*** сфарміраваць агульнае паняцце аб прыназоўніках, пазнаёміць з іх роллю ў сказе і правапісам, развіваць уменне правільна ўжываць прыназоўнікі; развіваць уменне пісаць пад дыктоўку, ажыццяўляць узаемаправерку; удасканальваць уменне тлумачыць правапіс слоў на вядомыя правілы; пазнаёміць са слоўнікавым словам *выйграць*; развіваць граматычны лад маўлення; выхоўваць беражлівыя адносіны да прыроды.

***Абсталяванне:*** шахматы; фотаздымкі скульптуры шахматнай ладдзі ў Гродна; фотаздымкі з дронамі, млынамі розных тыпаў.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 168.***

Праводзіцца конкурс на лепшага чытача скорагаворкі.

Вучні называюць стравы з бульбы, якія гатуюць у іх сем'ях, вусна падбіраюць праверачныя словы да слоў *ба**б**ка*, *абе**д*** і вызначаюць колькасць гукаў і літар у слове *будуць* (5 гукаў і 6 літар, літара ***ь*** гука не абазначае).

— На якія пытанні адказваюць словы, што абазначаюць прадметы? Прыметы прадметаў? Дзеянні прадметаў? Прывядзіце прыклады слоў са скорагаворкі.

**3. Этап знаёмства са слоўнікавым словам.**

Настаўнік прапануе вучням расставіць літары ў патрэбнай паслядоўнасці, каб расшыфраваць новае слоўнікавае слова:

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | 1 | 5 | 7 | 4 | 8 | 6 | 2 |
| й | в | р | ц | г | ь | а | ы |

— На якое пытанне адказвае гэта слова? Што абазначае?

— Вымавіце слова *выйграць*. Падзяліце яго на склады. *(*[вый'-грац'].*)* Колькі складоў у гэтым слове? *(2.)* Вымавіце слова, выдзяляючы голасам націскны склад. На які склад падае націск? *(На першы склад —* [вый'].*)* Назавіце гукі па парадку. *(*[в], [ы], [й'], [г], [р], [а], [ц'].*)* Колькі мяккіх зычных гукаў у гэтым слове? Якія? *(Два мяккія зычныя гукі —* [й'], [ц'].*)* Ці супадае колькасць гукаў і літар у слове? *(Не, не супадае. Літар больш, чым гукаў; літара **ь** гука не абазначае.)*

Вучні знаходзяць слова *выйграць* на форзацы вучэбнага дапаможніка, каменціруюць, на якой літары зроблены малюнак. Чытаюць слова так, як яно запісана, вызначаюць, ці супадае вымаўленне і напісанне слова. Настаўнік звяртае ўвагу на тое, што ў слове *выйграць* вымаўляем гук [й'] і перадаём яго на пісьме адпаведнай літарай — ***й***. Вучні запісваць слова ў сшытак, падкрэсліваюць літару ***й***.

Настаўнік прапануе дапісаць на дошцы словы, замяніўшы ў слове *выйграць вы* на *за (зайграць), (пайграць), пра (прайграць), да (дайграць)*.

— Прачытайце словы. Якое з іх з'яўляецца супрацьлеглым па значэнні да слова *выйграць*? Запішыце яго.

**4. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

Настаўнік вывешвае на дошку карткі са словамі.

— Прачытайце словы і размяркуйце іх на тры групы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| прачытаць | прыгожы | пад | лета |
| шчаслівы | выйграць | расфарбаваць | вясёлы |
| на | казка | альбом | |

* Этап работы па фарміраванні навыкаў каліграфічнага пісьма (чыстапісанне) уключаецца ў структуру ўрока настаўнікам і праводзіцца ў сістэме. Матэрыял па чыстапісанні адбіраецца з улікам тыповых графічных памылак вучняў класа.

Вучні перамяшчаюць карткі са словамі ў тры групы: словы, якія абазначаюць прадметы (лета, казка, альбом); словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў (прыгожы, шчаслівы, вясёлы); словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў (прачытаць, выйграць, расфарбаваць).

— Якія словы вы не размеркавалі ні ў адну з груп? Ці ведаеце вы, як яны называюцца?

— Словы *на*, *пад* — гэта прыназоўнікі.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік прапануе вучням назваць тэму ўрока і сфармуляваць мэты:

*На ўроку мы даведаемся... , навучымся... .*

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Два падрыхтаваныя вучні чытаюць па ролях праблемную сітуацыю на с. 126 вучэбнага дапаможніка.

— Прачытайце праблемнае пытанне. Як бы вы на яго адказалі? Дакладны адказ на пытанне вы зможаце даць пасля выканання практыкавання 169.

***Практыкаванне 169.***

Спачатку настаўнік прапануе вучням уявіць, што паветраныя шары са словамі вылецелі са сказаў. Вучні чытаюць сказы, якія атрымаюцца ў такім выпадку, затым — чытаюць сказы з гэтымі словамі.

— Які вывад вы можаце зрабіць: для чаго патрэбныя прыназоўнікі?

Арганізуецца запіс сказаў з каменціраваннем на дошцы. Вучні падкрэсліваюць у сказах прыназоўнікі, а ў слове *выйграць* — літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

— Як пішуцца прыназоўнікі з іншымі словамі?

Для пашырэння кругагляду вучняў дадаткова можна правесці гутарку на тэму «Што такое шахматы». (Шахматы — лагічная настольная гульня для двух гульцоў на шахматнай дошцы, якая складаецца з 64 квадратаў. Радзімай шахмат з'яўляецца Індыя. Узрост шахматных фігурак, якія час ад часу выкопваюць археолагі ў розных мясцінах Беларусі, дасягае да 1000 гадоў. Каля Замкавай гары ў Гродне як напамін пра шахматную фігурку XII ст., якая была знойдзена на тэрыторыі Беларусі, усталявана скульптура шахматнай ладдзі.)

Настаўнік можа падабраць і паказаць адпаведныя фотаздымкі.

Настаўнік паказвае шахматы.

— Хто з вас умее гуляць у шахматы? Ці гуляюць у шахматы ў вашай сям'і?

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучань услых чытае інфармацыю з рубрыкі «Трэба ведаць» (с. 127).

— Прывядзіце прыклады прыназоўнікаў. Для чаго яны служаць? Як пішуцца з іншымі словамі?

***Практыкаванне 170.***

Пасля прачытання тэксту вучні расказваюць, для чаго патрэбныя дроны.

— Ці бачылі вы дроны? Дзе і калі? Як яны выглядаюць? Што вам нагадваюць? (Настаўнік дэманструе фотаздымкі з дронамі.)

Вучні чытаюць сказы з прапушчанымі прыназоўнікамі, тлумачаць правапіс слоў на ўжо вядомыя ім правілы, пасля чаго запісваюць сказы пад дыктоўку настаўніка і выконваюць узаемаправерку.

**5. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 171.***

Настаўнік прапануе вучням разгледзець малюнак і адказаць на пытанні:

— Што бачыце на малюнку? Ці бачылі вы калі-небудзь млын? Дзе? Для чаго патрэбны млын?

(Млын — гэта гаспадарчае збудаванне, абсталяванае механізмам для абмалоту зерня. Асноўнымі часткамі млына з'яўляюцца жорны і рухаючы механізм. Млыны падзяляюцца на тры тыпы: вадзяныя, ветраныя (ветракі) і паравыя.)

Настаўнік дэманструе фотаздымкі з млынамі розных тыпаў.

— Які час сутак адлюстраваны на малюнку? Што на гэта ўказвае?

Кожны вучань вызначае, заданне «пілота» ці «касманаўта» будзе выконваць, самастойна запісвае адпаведны сказ у сшытак. Адзін «пілот» і адзін «касманаўт» выконваюць заданне на дошцы. Пасля чаго праводзіцца праверка: вучні, якія працавалі каля дошкі, тлумачаць правапіс слоў, пры гэтым яшчэ раз акцэнтуецца ўвага на тым, што прыназоўнікі з іншымі словамі пішуцца асобна.

***Практыкаванне 172.***

Вучні чытаюць назву тэксту, разглядаюць малюнак і выказваюць свае меркаванні адносна таго, аб чым будзе ісці гаворка ў тэксце.

— Пра што расказваецца ў тэксце? Якая яго асноўная думка? Якія пачуцці перадае аўтар? У канцы якіх сказаў стаіць клічнік? Як гэтыя сказы трэба прачытаць? (Некалькі вучняў чытаюць сказы з адпаведнай інтанацыяй.)

Тлумачэнне правапісу прапушчаных літар у словах праводзіцца франтальна. Вызначаюцца і зачытваюцца словы, ужытыя з адзначанымі ў вучэбным дапаможніку прыназоўнікамі. Кожны вучань самастойна спісвае словы, ужытыя з прыназоўнікамі.

**6. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 130, практ. 173. Настаўнік нагадвае, што верш трэба запісаць у слупок.

**7. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якія прыназоўнікі вы запомнілі? Для чаго служаць прыназоўнікі? Як яны пішуцца з іншымі словамі?

## Урок 82. Прыназоўнік

***Мэты ўрока:*** развіваць уменне правільна ўжываць прыназоўнікі ў вусным маўленні, правільна пісаць прыназоўнікі з іншымі словамі, змяняць сэнс спалучэнняў слоў на супрацьлеглы з дапамогай прыназоўнікаў; развіваць уменне пісаць пад дыктоўку, ажыццяўляць узаемаправерку; адпрацоўваць уменне падбіраць да тэксту загаловак, тлумачыць правапіс слоў на вядомыя правілы; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць клапатлівыя адносіны да жывёл.

***Абсталяванне:*** фотаздымкі хаты з печчу; малюнкі для задання на дошцы (кацяня на канапе, кацяня за канапай; кацяня каля канапы);

карткі для самастойнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 173.***

Адзін вучань чытае верш услых.

— Якія пачуцці перадаюцца ў вершаваных радках? Раскажыце, як вы адпачываеце летам.

Праводзіцца ўзаемаправерка выкананага пісьмовага задання.

Вучні называюць прыназоўнікі, якія сустрэліся ў вершы, тлумачаць, як напісалі іх з іншымі словамі.

— Як прыназоўнікі пішуцца з іншымі словамі? Назавіце прыназоўнікі, якія вы ведаеце.

***Выкананне калектыўнага задання на дошцы.***

Настаўнік прапануе вучням разгледзець малюнкі, дапоўніць спалучэнні слоў патрэбнымі прыназоўнікамі і расказаць, дзе знаходзіцца кацяня.



кацяня ... канапе | кацяня ... канапай | кацяня ... канапы

**3. Этап замацавання.**

***Практыкаванне 174.***

Выкананне задання арганізуецца франтальна. Вучань чытае спалучэнне слоў, з апорай на малюнак змяняе яго сэнс на супрацьлеглы з дапамогай прыназоўнікаў і запісвае на дошцы. Астатнія вучні фіксуюць спалучэнні слоў у сшытках. Такім чынам праводзіцца праца з кожным спалучэннем слоў. Пры гэтым акцэнтуецца ўвага на асобным напісанні прыназоўнікаў са словамі. *(Убачыў перад плотам, ехаў з гаража, паклаў за тэлефонам, пайшоў ад сябра.)*

***Практыкаванне 175.***

Вучні чытаюць загадкі, вызначаюць правільную адгадку да кожнай з іх, аргументуюць свой выбар. Затым у кожным сказе знаходзяць прыназоўнікі, тлумачаць, што яны пішуцца асобна; вызначаюць, што абазначаюць словы, да якіх яны адносяцца (прадметы).

Кожны вучань самастойна вызначае загадку для запісу. Пасля спісвання праводзіцца самаправерка выкананага задання.

***Практыкаванне 176.***

Настаўнік прапануе вучням прачытаць назву тэксту, разгледзець малюнак і паразважаць, аб чым можа ісці гаворка ў ім. Пасля прачытання тэксту вучні вяртаюцца да сваіх «прагнозаў», удакладняюць або выпраўляюць свае адказы.

Абмеркаванне зместу тэксту можна правесці з выкарыстаннем наступных пытанняў:

— Калі і дзе адбываюцца падзеі, апісаныя ў тэксце? Чаму ўсе, хто ўвайшоў у хату, спужаліся? Якія птушкі заляцелі ў хату? Як гэта адбылося?

Настаўнік паказвае фотаздымкі хаты з печчу, тлумачыць вучням, што такое комін, дзе ён знаходзіцца.

Тлумачэнне правапісу слоў праводзіцца франтальна. Пасля вызначэння колькасці сказаў у апошняй частцы тэксту кожны вучань самастойна запісвае яе, правільна афармляючы сказы на пісьме. Арганізуецца ўзаемаправерка выкананага задання.

**4. Этап выканання самастойнай работы.**

Кожны вучань атрымлівае картку з заданнем.

> Прачытайце тэкст. Дапішыце прапушчаныя прыназоўнікі.
>
> Аленка любіць назіраць ___ (за) птушкамі. Яна запісвае ___ (ў) тэлефон іх галасы. ___ (У) кожнай птушкі свая песня. ___ (У) маі прыгожа спяваюць салаўі!
>
> З першага сказа выпішыце словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае.
>
> ______________________________
>
> Які гук, характэрны для беларускай мовы, сустракаецца ў гэтых словах? Запішыце ў квадратных дужках. [   ]
>
> Колькі ў першым сказе слоў, якія абазначаюць прадмет? Запішыце адпаведную лічбу. ☐

Праверка задання ажыццяўляецца настаўнікам.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 132, практ. 177. Настаўнік тлумачыць, што каламбур — гэта жарт, заснаваны на камічным выкарыстанні блізкіх па гучанні, але розных па значэнні слоў; гульня слоў. Вучні называюць аднолькавыя па гучанні і запісе словы, што сустрэліся ў прапанаваным каламбуры.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Дагаварыце кожны сказ:

Я ведаю наступныя прыназоўнікі...

Прыназоўнікі служаць...

З іншымі словамі прыназоўнікі пішуцца...

## Урок 83. Паўтарэнне

***Мэты ўрока:*** замацаваць і сістэматызаваць веды пра словы — назвы прадметаў, прымет прадметаў, дзеянняў прадметаў; адпрацоўваць арфаграфічныя ўменні і навыкі, уменне размяшчаць словы ў алфавітным парадку; удасканальваць уменне працаваць з тлумачальным слоўнікам; развіваць мысленне, звязнае вуснае маўленне; выхоўваць беражлівыя адносіны да хлеба.

***Абсталяванне:*** карта Рэспублікі Беларусь; тлумачальны слоўнік; карткі са словамі *палена, марынад, верасень, тканіна, макарона*; фотаздымак (малюнак), на якім адлюстравана дзяжа;



карткі для работы ў парах.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 177.***

Вучні чытаюць каламбур, тлумачаць, чым адрозніваюцца словы, аднолькавыя па гучанні і запісе. (У першым выпадку: *(над)* ***полем*** — слова, якое абазначае прадмет; у другім — ***полем*** абазначае дзеянне.)

— Якія прыназоўнікі сустрэліся ў каламбуры? *(Над, з.)* Назавіце словы, якія абазначаюць

прадметы. *(Сонца, полем, капусту, сяброўкамі.)* Колькі ў вершы слоў, якія абазначаюць дзеянне прадмета? *(Адно слова — полем.)*

— Ці дапамагалі вы калі-небудзь дарослым у полі? Што рабілі?

**3. Этап паўтарэння і замацавання вывучанага матэрыялу.**

***Паўтарэнне правапісу слоўнікавых слоў.***

Праводзіцца работа ў парах. Настаўнік раздае картку з заданнем на кожную парту. Вучні па чарзе дапісваюць прапушчаныя літары.

Дапішыце прапушчаныя літары ў слоўнікавыя словы.




Зафарбуйце словы, якія абазначаюць **прадметы**, жоўтым алоўкам; словы, якія абазначаюць **прыметы прадметаў**, — зялёным алоўкам; слова, якое абазначае **дзеянне прадмета**, — сінім алоўкам.

***Практыкаванне 178.***

Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні разгадваюць рэбусы і дапаўняюць сказы словамі *Нарач*, *Полацк*. Настаўнік паказвае на карце, дзе знаходзіцца возера Нарач і горад Полацк.

— З якой літары трэба запісаць словы *Нарач*, *Полацк*? Чаму? Якія яшчэ словы запісаны ў сказах з вялікай літары? Чаму?

Запіс сказаў праводзіцца з каменціраваннем.

— Ці ведаеце вы, якія азёры яшчэ ёсць у Беларусі? (Настаўнік можа прапанаваць вучням адшукаць азёры на карце.)

— Якой літары ўстаноўлены помнік у горадзе Полацку? *(Літары **ў**.)* Чаму менавіта гэтай літары?

***Практыкаванне 179.***

Настаўнік размяшчае карткі са словамі з практыкавання на дошцы.

Вучні чытаюць словы і тлумачаць іх значэнне, пры неабходнасці знаходзяць словы ў тлумачальным слоўніку. Затым на картках падкрэсліваюць (абводзяць маркерам) імёны, якія «схаваліся» ў словах.

Вучні ўспамінаюць алфавіт: па ланцужку называюць літары; пасля чаго запісваюць імёны ў алфавітным парадку: *Алена, Вера, Іна, Макар, Марына, Ніна*. Запіс слоў паслядоўна арганізуецца на дошцы і ў сшытках. Вучань, які першы правільна вызначае слова, запісвае яго на дошцы.

Настаўнік прапануе вучням вусна паставіць пытанні да слоў у падручніку і да запісаных слоў.

— На якія дзве групы можна размеркаваць запісаныя словы?

Вучні могуць прапанаваць розныя крытэрыі для групоўкі. Напрыклад: двухскладовыя і трохскладовыя словы; словы, якія абазначаюць жаночыя імёны і мужчынскія імёны і інш.

***Практыкаванне 180.***

Перад прачытаннем тэксту вучням мэтазгодна задаць наступныя пытанні:

— Ці бачылі вы, як выпякаюць хлеб? Што для гэтага патрэбна?

Варта звярнуць увагу на значэнне слова *дзяжа*, якое сустрэнецца ў тэксце, паказаць адпаведны фотаздымак (малюнак).

Пасля прачытання тэксту вучні вызначаюць яго тэму і асноўную думку, расказваюць, як выпякалі хлеб раней; тлумачаць, чым адрозніваюцца малюнкі ў вучэбным дапаможніку, і вызначаюць той, які адпавядае тэксту.

Дадаткова настаўнік можа задаць наступныя пытанні:

— Ці выпякаюць зараз хлеб у печы? Якую каштоўную параду могуць знайсці гаспадыні ў прапанаваным тэксце?

Тлумачэнне правапісу прапушчаных літар у словах праводзіцца франтальна. *(Выпякалі, драўлянай, шырокае, кляновае, лісце, крышылася.)*

— Успомніце, на якія пытанні адказваюць словы, што абазначаюць прадметы.

Вучні паслядоўна чытаюць кожны сказ і выпісваюць словы, якія абазначаюць прадметы. Запіс слоў арганізуецца на дошцы і ў сшытках. Варта звярнуць увагу вучняў на тое, што, калі слова ў тэксце паўтараецца некалькі разоў, яго запісваем толькі адзін раз. *(Хлеб, гаспадыня, рукамі, цеста, дзяжы, боханы, лапаце, мукою, печ, лісце, скарынка.)*

***Практыкаванне 181.***

Настаўнік чытае верш. Вучні вызначаюць, аб чым расказваецца ў тэксце, падбіраюць да яго назву.

— Чым, на думку аўтара, пахне хлебная скарынка? Ці згодныя вы з аўтарам? Свой адказ аргументуйце.

Вучні ў парах тлумачаць правапіс выдзеленых літар у словах.

Пісьмовае заданне выконваецца на дошцы з каменціраваннем. Вучні запісваюць словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, разам са словамі, да якіх яны адносяцца, пры гэтым ставяць пытанне: скарынка (*якая?*) хлебная, ветрыкам (*якім?*) цёплым, дождж ыкам (*якім?*) летнім, дожджыкам (*якім?*) грыбным, полем (*якім?*) аржаным, пазалотай (*якой?*) асенняй, работай (*якой?*) натхнёнаю.

— Як вы думаеце, ці лёгка вырасціць хлеб?

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 135, практ. 182. Вучні вусна складаюць прыказкі з частак і вызначаюць, што іх аб'ядноўвае.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якія правілы правапісу паўтаралі на ўроку?

— Якое заданне для вас было самым цікавым? Якое — самым складаным?

## Урок 84. Паўтарэнне

***Мэты ўрока:*** замацаваць і сістэматызаваць веды пра мову, маўленне (вуснае і пісьмовае), сказ, слова, склад, гукі беларускай мовы; адпрацоўваць вымаўленчыя навыкі, арфаграфічныя ўменні і навыкі, уменне пісаць па памяці; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць любоў да роднага краю, роднай мовы.

***Абсталяванне:*** тлумачальны слоўнік; карткі са словамі *мова, літара, склад, тэкст, слова, гук, сказ*; фотаздымкі са старажытнымі кнігамі.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання.**

***Практыкаванне 182.***

Вучні чытаюць прыказкі і тлумачаць іх сэнс, называюць словы, якія абазначаюць прадметы. *(Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.* — Тое, што робіш сам, прыносіць асаблівую радасць, асалоду. *Без хлеба няма абеду.* — Калі есці страву без хлеба, то будзе не так смачна; хлеб традыцыйна падчас абеду быў на стале, раней без хлеба не елі ні адной стравы. *Калі хлеб у возе, то няма бяды ў дарозе.* — Калі ў дарогу ўзяў з сабой хлеб, то галодным не будзеш.*)*

**3. Этап паўтарэння і замацавання вывучанага матэрыялу.**

***Практыкаванне 183.***

Словы з практыкавання можна надрукаваць на асобных картках і прапанаваць вучням размясціць іх на дошцы ў правільнай паслядоўнасці, пры гэтым аргументаваць свой выбар. Напрыклад:

[мова] [тэкст] [сказ] [слова] [склад] [гук] [літара]

Вучні могуць размясціць карткі і ў адваротнай паслядоўнасці.

Настаўнік задае пытанні:

— Для чаго патрэбна мова? Якая нацыянальная мова беларусаў? Як трэба ставіцца да сваёй роднай мовы? Чаму?

Затым вучні запісваюць словы з практыкавання пад дыктоўку настаўніка. Правяраюць правільнасць напісання шляхам зверкі з узорам на дошцы.

***Практыкаванне 184.***

Перад чытаннем верша неабходна звярнуць увагу на тлумачэнне значэння наступных слоў:

*бруіцца* — цячы, пераліваючыся; так звычайна кажуць пра ручай, крыніцу;

*нашчадкі* — людзі будучых пакаленняў.

Можна прапанаваць вучням знайсці значэнне гэтых слоў у тлумачальным слоўніку.

Настаўнік чытае верш, вучні слухаюць і прадумваюць адказ на пытанне «Пра якую мову ў ім гаворыцца?».

— Якая асноўная думка верша? Як аўтар адносіцца да Радзімы і да роднай мовы? Якія словы з верша на гэта ўказваюць?

— Успомніце і вымавіце гукі, характэрныя для беларускай мовы. *(Гукі* [ў], [дз'], [ц'], [г], [г'].*)* Якія з названых гукаў на пісьме перадаецца дзвюма літарамі? Якімі?

Вучні знаходзяць у вершы словы з гукам [дз']: *адзіная, Радзімаю, дзядоў, прадзедаў.* Кожны вучань самастойна запісвае ў слупок сказ з гэтымі словамі.

— Якія вершы пра родную мову на памяць ведаеце вы? Раскажыце.

***Практыкаванне 185.***

— Ці памятаеце вы, хто стварыў славянскую азбуку? *(Кірыла і Мяфодзій.)* Як называюць славянскую азбуку? *(Кірыліцай.)*

Вучні чытаюць тэкст, пасля чаго расказваюць, пра што даведаліся, адказваюць на пытанні з вучэбнага дапаможніка, пераказваюць другую частку тэксту.

— Падбярыце слова, блізкае па значэнні да слова *азбука*. Успомніце ўсе літары алфавіта. (Вучні па ланцужку называюць літары беларускага алфавіта.) Для чаго трэба ведаць алфавіт?

Вучні запісваюць словы *азбука*, *алфавіт*, вызначаюць, на якія пытанні яны адказваць, што абазначаюць. *(Адказваюць на пытанне што?, абазначаюць прадмет.)*

Настаўнік прапануе вучням разгледзець старажытную і сучасную кнігі на малюнку ў вучэбным дапаможніку, параўнаць іх (пры гэтым варта звярнуць увагу на памеры кнігі, яе афармленне). Пажадана дадаткова падабраць іншыя фотаздымкі са старажытнымі кнігамі.

***Практыкаванне 186.***

Пасля прачытання верша настаўнік можа задаць наступныя пытанні:

— Што аўтар гаворыць пра гукі роднай мовы? Да чаго аўтар заклікае нас? Як вы думаеце чаму?

Затым вучні адказваюць на пытанні, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку. Называюць звонкія зычныя гукі, пры гэтым можна звярнуцца да стужкі літар, якая ёсць у класе. Дадаткова можна прапанаваць назваць гукі, парныя па звонкасці-глухасці.

Вучні вызначаюць радкі, у якіх заключана асноўная думка верша, знаходзяць у гэтым сказе словы на вядомыя правілы, тлумачаць іх правапіс; запісваюць два апошнія радкі верша па памяці.

**4. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Што сёння паўтаралі на ўроку? Што аб'ядноўвае вершы, якія чыталі?

Настаўнік жадае вучням добра адпачыць падчас летніх канікул, размаўляць па-беларуску і вандраваць па роднай краіне.

**Крыніцы ілюстрацый:**
https://i.pinimg.com/originals/5e/aa/d2/5eaad242477e2ee45f05455b2085e8da.png;
https://yt3.ggpht.com/ytc/AMLnZu9jPsYzAE0p9y4aRStkIlgZiiRyf_dpEEJXpOI0=s900-c-k-c0x00ffffff-no-rj.